# ВАЕННАЯ СПРАВА Ў СПАРЦЕ

**П. В. Аслюк**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск;*
*reidnex@gmail.com;*
*навук. кір. – В. Г. Пракапчук, канд. філал. навук, дац.*

У артыкуле разглядаецца ваенная справа спартанскай дзяржавы, узбраенне спартанскіх воінаў і іх тактыка на матэрыяле першасных антычных крыніц і сучасных даследаванняў. Паказана, як апісвалі структуру спартанскай арміі Фукідыд і Ксенафонт. Установлена, што тактыка спартанцаў не адрознівалася ад тактыкі астатніх грэкаў, але яны мелі перавагу за кошт дысцыпліны і высокай ваеннай падрыхтоўкі.

***Ключавыя словы:*** Ксенафонт; Лакедэмонская палітэя; аспіс; торакс; доры; энаматыя; мора.

Спарта радыкальна адрознівалася ад астатніх грэцкіх дзяржаў, што было заўважана яшчэ старажытнымі гісторыкамі. Спартанцы, суровы і немнагаслоўны народ, не пакінулі пасля сябе ні філосафаў, ні хранографаў, ні паэтаў. Усе дакументальныя крыніцы былі напісаныя людзьмі, якія нарадзіліся не ў Спарце. Першая з іх – «Лакедэмноская палітэя» Ксенафонта [4], напісаная яшчэ ў час росквіту Спарты. У ёй Ксенафонт апісвае многія аспекты жыцця спартанцаў, ад жаніцьбы і нараджэння дзяцей да баявога парадку лакедэмонскага войска і іх рэлігійных абрадаў. Другой важнай крыніцай з'яўляецца «Жыццёапісанне Лікурга» Плутарха [5], у якім, акрамя біяграфіі Лікурга, было апісана і паўсядзённае жыццё спартанцаў. Таксама апісанні спартанскага ладу жыцця мы сустракаем у Герадота, Фукідыда, Арыстотэля і Платона. Пра ваенную справу Спарты і яе шматлікія войны мы даведваемся з «Гісторыі» Герадота [1] і Фукідыда [8], а таксама Ксенафонта[3]. Некаторыя звесткі аб структуры арміі даюцца і ў «Лакедэмонскай палітэі».

**1. Гісторыя арміі.** Армейскую рэформу, як і любую іншую ў Спарце, прыпісваюць Лікургу. Звязана гэта з заканадаўцам ці не, не вядома, але ў VIII ст. да н.э. Спарта імкліва пачынае ўзмацняцца. Яна падпарадкоўвае сабе сваіх суседзяў, у час грэка-персідскіх войнаў становіцца адной з мацнейшых дзяржаў Сярэдземнага мора. Росквіт спартанскай арміі прыходзіцца на гэты час, а Пелапанэская вайна ўзносіць Спарту да ўзроўню гегемона Грэцыі. Пасля некалькіх паразаў ад Фіваў і праз дэмаграфічны крызіс у IV ст. да н.э. спартанская армія змяншаецца і аслабляецца [12, p. 278].

**2. Структура арміі.** Лакедэмонская абшчына дзялілася на тры класы: спартыяты, перыэкі і ілоты. Паўнапраўнымі былі толькі спратыяты, яны складалі аснову арміі.

Асноўныя дзве крыніцы па арганізацыі спартанскай арміі – «Лакедэмонская Палітэя» Ксенафонта і апісанне бітвы пры Мантынэі ў 418 г. да н.э. Фукідыдам.

Па Фукідыду, падзяленне арміі было такое: «*Па звычаю цар Агіс аддаваў усе распаражэнні, бо калі цар лакедэманянаў удзельнічае ў паходзе, то ўсе загады ідуць ад яго. Ён перадае неабходныя распараджэнні палемархам, тыя – лахагам, лахагі – пентэкантэрам, гэтыя ж – энаматархам, а апошнія, нарэшце, – энаматыі*» (Фукідыд, 5, 66, 10–15).

Такім чынам, найменшай тактычнай адзінкай у спартанскай арміі была энаматыя (ἐνωμοτία), якая складалася прыкладна з 32 чалавек і камандавалася энаматархам (ἐνωμοτάρχης). Чатыры энаматыі складалі пентэкастыю (πεντηκοστύς, 128 чалавек), якой камандаваў пентэкантэр (πεντηκοντήρ). Чатыры пентакастыі складалі лох (λόχος, 512 чалавек), якім камандаваў лахаг (λοχαγός). Усяго ў спартанскай арміі было 6 лохаў, або мораў, як іх называе Ксенафонт.

Ксенафонт па-іншаму апісвае спартанскую армію: «*Зрабіўшы ўсё такім чынам, ён [Лікург] падзяліў вершнікаў і гаплітаў на 6 мораў. Кожная мора, якая складаецца з гаплітаў, мае аднаго палемарха, чатырох лахагаў, восем пентэкантэраў, шаснаццаць энаматархаў. З гэтых мораў па слову каманды фарміруюцца падраздяленні то па тры, а то і па шэсць энаматый у рад*» (Ксенафонт, ЛП, 11, 4).

Такім чынам, згодна з Ксенафонтам, падзяленне арміі наступнае. Найменшая адзінка зноў энаматыя (36 чалавек), якой камандуе энаматарх, дзве энаматыі складаюць пентакастыю (72 чалавекі), якой камандуе пентэкантэр, дзве пентакастыі складаюць лох (144 чалавекі), якім камандуе лахаг, з чатырох лохаў складаецца мора (μόρα, 576 чалавек), якой камандуе палемарх (πολέμαρχος), і ўся армія складаецца з шасці мораў

Высокі ўзровень арганізацыі спартанскай арміі і вялікая колькасць афіцэраў у ёй сведчылі пра развітасць войска. Нават армія прафесійных наймітаў, як 10 000, апісаных Ксенафонтам у «Анабасісе», не мела афіцэраў ніжэй за лахагаў (у «Анабасісе» лох складаецца са ста чалавек) [2, с. 12]. Вялікая колькасць асобных атрадаў дазваляла спартанцам эфектыўней перадаваць загады ці перастройвацца падчас бітвы ці маршу.

**3. Узбраенне спартанскага воіна.** У спартанскай арміі было некалькі родаў войскаў і кожны з іх меў рознае ўзбраенне.

Шчыт быў самай важнай часткай узбраення гапліта (ὁπλίτης). Называўся ён аспіс (ἀσπίς) і ў дыяметр быў ад 80 сантыметраў да метра, закрываючы такім чынам цела воіна ад падбародка да кален, важыў каля 7 кілаграмаў і быў каля 30–35 мм у таўшчыню. Вырабляўся з дрэва, а потым аббіваўся бронзай. Аспіс быў выгнуты вонкі, каб яго было лягчэй трымаць, верхнюю кромку можна было абаперці на плячо. У шчыта было дзве ручкі, першая, порпакс (πόρπαξ), была ў цэнтры, праз яе прадзявалася па локаць рука, а затым пясцю бралася другая ручка, антылабэ (ἀντιλαβή), якая знаходзілася на краі шчыта, каля кромкі. Звычайна шчыты размалёўваліся, на іх наносілі розныя знакі, сюжэты з грэцкай міфалогіі [12, р. 29–35].

Даспех воіна складаўся са шлема (κράνος), нагрудніка (θώραξ) і паножаў (κνημίδες).

Бронзавы шлем быў адной з найважнейшых частак абмундзіравання любога гапліта. Найбольш распаўсюджаным быў карынфскі шлем, які цалкам пакрываў галаву, закрываў вушы і большую частку твару. Спераду былі выразы для вачэй і абарона для носа. На шлемах маляваліся ці выразаліся ўзоры і ўпрыгожанні [13, р. 54–59].

Спартыяты насілі некалькі відаў нацельнага даспеха, у старажытнагрэцкай мове ўвогуле ўсе даспехі называлі тораксам (θώραξ, даслоўна грудзі). Першымі панцырамі гаплітаў былі бронзавыя даспехі, якія цалкам закрывалі грудзі і спіну, а таксама бакі. Часта пярэдняй пласціне давалі форму мускулатуры жывата. Таксама выкарыстоўваўся лінаторакс (λινοθώραξ, даспех са льну). Ён складаўся з некалькіх лістоў лёну, якія стваралі тоўсты абаронны слой [13, р. 42–46].

Паножы-кніміды рабіліся з бронзы і прымацоўваліся да нагі воіна, закрываючы яе ад калена да ступні [13, р. 46–47].

Асноўнай зброяй любога гапліта была дзіда, доры (δόρυ). У даўжыню яна была ў сярэднім каля 2–3 метраў. Наканечнік быў бронзавы або жалезны і меў форму кроплі. Акрамя наканечніка ў дзіды быў і стыракс (στύραξ), які мацаваўся на другім яе канцы. Ён служыў як баланс для ўсёй дзіды, а таксама дазваляў зручна ўтыкаць яе ў зямлю і меў функцыю другога наканечніка, калі асноўны адламваўся [13, р. 85–87].

Як запасную зброю гапліт меў меч ксіфас (ξίφος). Гэта быў жалезны, абаюдавостры меч. Падыходзіў ён і для таго, каб калоць, і каб рэзаць. У V стагоддзі да н. э. з'яўляецца новы тып мяча – копіс, або махайра (κόπις, μάχαιρα). Гэта быў больш доўгі меч, якім было зручней рэзаць [11, р. 85–87].

Усе мячы насіліся ў драўляных або скураных ножнах, якія перакідваліся цераз плячо, так, каб яны віселі з левага боку, за шчытом, каб у баі меч можна было лёгка дастаць правай рукой.

Пельтаст (πελταστής) – гэта лёгка ўзброены войн, застрэльшчык, які кідае легкія дзіды ў ворага. Пельтаст звычайна насіў легкі шлем ці ніякага. Даспехаў не насілі, толькі туніка ці хітон. Мелі авальныя шчыты з выразамі ў сярэдзіне – пельты (πέλτα), ад якіх і пайшла назва гэтага роду войскаў. Узброеныя яны былі легкім дзідамі для мятання. Іх пельтаст меў тры ці чатыры, адна трымалася ў правай руцэ, шчыт жа надзяваўся на локаць левай, што дазваляла трымаць дзіды ў пясці. Таксама пельтаст быў узброены мячом [9, p. 146–150].

Кавалерыя ў спартанскай арміі з’явілася позна і яе ўзбраенне не адрознівалася ад таго, якое было ў астатніх грэкаў. Вершнік насіў паножы, шлем і лёгкі даспех, меў дзіду і копіс.

**4. Тактыка спартанцаў.** Стандартнай тактыкай спартанцаў была агульная для ўсіх грэкаў фаланга (φάλαγξ), якая ўяўляла сабой шчыльны пяхотны строй. Гапліт выстаўляў уперад шчыт і закрываў яго левай кромкай правую кромку шчыта суседа і трымаў дзіду паверх шчыта. Як вынік – фаланга аказвалася моцнай і глыбокай сцяной шчытоў, якую было вельмі цяжка атакаваць спераду. У бітве самым пачэсным лічыўся правы фланг, паколькі шчыт гапліт трымаў у левай руцэ, а з правага боку быў горш абаронены.

Асноўным адрозненнем спартанскай фалангі ад фаланг астатніх грэкаў было не яе пастраенне, а ўзровень падрыхтоўкі і дысцыпліны спартыятаў. Спартыят быў прафесійным воінам і ўвесь свой час выдаткоўваў на страявую падрыхтоўку і практыкаванні са зброяй. Праз высокую дысцыпліну і вялікую колькасць афіцэраў звычайна непаваротлівая і марудная фаланга ў руках спартанцаў аказвалася хуткай і манеўрэнай [8, с. 377–378].

**Высновы.** Спартанская армія, безумоўна, была наймацнейшай у класічнай Грэцыі. Пастаянная муштра, трэніроўкі, жорсткая дысцыпліна, серыя бліскучых перамог і гераічных параз зрабілі са спартанцаў легенду, сапраўдных багоў вайны. Спартанская дзяржава аслабла і рухнула, а спартанскія воіны заставаліся прыкладам і для рымскіх імператараў, і для візантыйцаў, і для грэцкіх рэвалюцыянераў. І нават зараз, праз 2400 гадоў пасля росквіту Спарты, у многіх арміях свету звяртаюцца да спартанскіх легенд. Фразы, сказаныя ў даўніну, як Леанідаўскае μολὼν λαβέ (“прыйдзі і вазьмі”), умацаваліся ў галовах людзей як сымбаль барацьбы і непакорнасці. Але сапраўдным помнікам майстэрству спартанцаў з’яўляецца тое, што больш чым праз 2000 гадоў мы помнім пра іх подзвігі, перамогі і паразы.

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1. Геродот. История / Пер. с древнегреч. Г. Стратановского. – М.: Издателство АСТ, 2021. – 832 с.

2. Ксенофонт. Анабасис / Пер., статья, ком. М. Максимовой. – СПб.: Азбука, Азбука-Аттикус, 2021. – 320 с.
3. Ксенофонт. История Греции. – М.: АСТ, Астрель, 2010. – 448 с.
4. Ксенофонт. Лакедемонская полития / Пер. с древнегреч., вступ. ст. и коммент. Л. Г. Печатновой. – СПб.: ИЦ «Гуманитарная Академия», 2014. – 224 с.
5. Плутарх. Избранные жизнеописания. В двух томах. Пер. с древнегр. / Сост., вступ. ст., прим. М. Томашевской; Ил. Вл. Медведева. – Том 1. – М.: Правда, 1986. – 592 с.
6. *Савельев, А.* Настоящая Спарта. Без домыслов и наветов / А. Савельев. – М.: Книжный мир, 2011. – 956 с.
7. *Строгецкий, В. М.* Афины и Спарта. Борьба за гегемонию в Греции в V в. до н. э. (478-431 гг.) / В. М. Строгецкий. – М.: Издательство Санкт-Петербургского университета, Акра, 2008. – 292 с.
8. Фукидид. История / Пер. с др.-греч. Г. А. Стратановского. – СПб.: Азбука, Азбука-Аттикус, 2021. – 800 с.
9. Armies of Ancient Greece circa 500–338 BC, History, Organization, Equipment / Gabriele Esposito. – Pen & Sword Books Limited, South Yorkshire, 2020. – 194 p.
10. Hoplites at War: a comprehensive analysis of heavy infantry combat in the Greek world, 750–100 BCE / Paul M. Bardunias and Fred Eugene Ray, Jr. – Jefferson, North Carolina: McFarland & Company, Inc., 2016. – 233 p.
11. Sparta at War: Strategy, Tactics and Campaigns, 550–362 BC / Scott M. Rusch. – Yorkshire, Frontline Books, 2011. – 399 p.
12. The Spartan Army / J. F. Lazenby. – Pen & Sword Books Limited, South Yorkshire, 2012. – 304 p.
13. Warfare in Ancient Greece / Tim Everson. – Gloucestershire, The History Press, 2013. – 156 p.